**Валанцёрская акцыя «Дабрыні адкрыюцца сэрцы»**

Стала штогадовай традыцыяй напярэдадні свята - Дня пажылых людзей правядзенне спецыялістамі ДУ «ТЦСАН» валанцёрскай акцыі «Дабрыні адкрыюцца сэрца».

У гэтым годзе для ўдзелу ў акцыі прыцягнуты валанцёры з Жупранскай сярэдняй школы. У рамках акцыі былі наведаны пажылыя людзі, якія знаходзяцца ў:

- бальніцы сястрынскага догляду ў аг. Мурованая Ашмянка;
- доме сумеснага самастойнага пражывання для грамадзян пажылога ўзросту;
- аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў у а/г Жупраны.

Салодкія падарункі (пячэнне, пірагі) былі прыгатаваныя рукамі сацыяльных работнікаў Цэнтра.

Школьнікі-валанцёры падарылі пажылым людзям, акрамя паштовак ручной працы, цяпло сваіх сэрцаў, добрыя словы і падтрымку.







